РаЗМЕРКАВАННЕ

# На варце СанПіНаў

## Тут галоўнае — прафілактыка

**За работай практычна любой установы — дзіцячага садка, прадуктовай крамы ці аўтамайстэрні — стаіць цэлы шэраг працэдур, пра якія звычайнаму абывацелю вядома мала. У кожным раёне краіны існуюць спецыяльныя цэнтры, якія займаюцца кантролем вытворчага працэсу, аберагаючы насельніцтва ад небяспекі. У Чэрвеньскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі прыехалі адразу два маладыя спецыялісты са сталіцы. Пра дэталі сваёй работы і першыя ўражанні ад новага месца яны расказалі карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

— Я родам з Віцебскай вобласці, з Глыбокага, — расказвае **ўрач-гігіеніст аддзела гігіены Наталля СВЯДЫШ**. — Пасля школы паступіла ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт на спецыяльнасць «Медыка-прафілактычная справа». Прызнаюся, вучыцца было цяжка, асабліва першыя тры курсы. Даводзілася вучыць СанПіНы (санітарныя правілы і нормы), гэта вельмі вялікія аб'ёмы інфармацыі. Але я старалася, ніколі не была на перасдачах.

На Чэрвеньшчыну дзяўчына трапіла яшчэ год таму — выйшла замуж, яе выбраннік якраз працуе галоўным інжынерам у адной з мясцовых гаспадарак па размеркаванні. Маладая сям'я жыве ў аграгарадку Заполле — гэта бліжэй да Мінска. Менавіта таму Наталля сама шукала для сябе першае месца працы ў раёне. Так супала, што ў мясцовым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі была патрэба ў новых кадрах. Штодзень дзяўчына дабіраецца сюды на маршрутцы — выходзіць 4 рублі на дарогу туды-назад. Але кіраўніцтва абяцае ўнесці змяненні ў калектыўны дагавор, каб з'явілася магчымасць кампенсаваць выдаткі на транспарт.

**«Галоўнае, што падабаецца, — магчымасць нармальна прагуляцца ў цішыні і спакоі».**

— У абавязкі ўрача-гігіеніста ўваходзіць кантроль санітарнага стану ў раёне, — уводзіць у курс справы Наталля. — Уся работа дзеліцца на чатыры кірункі: камунальная гігіена, гігіена працы, гігіена дзяцей і падлеткаў і гігіена харчавання. Я займаюся першымі трыма. Ёсць спецыяльны каардынацыйны план, у якім распісаны праверкі самых розных устаноў раёна на цэлы год. Усе яны падраздзяляюцца на групы: высокай рызыкі (звычайна ўсё, што звязана з харчаваннем і дзецьмі), гэта правяраюць раз на год, а таксама сярэдняй і нізкай, там праверкі радзейшыя. У адпаведнасці з планам я прызначаю канкрэтную дату і раблю выезд. Першы раз, напрыклад, ездзіла на прадпрыемства па вытворчасці вырабаў з пластыку ў Смілавічах. На месцы правяраем, каб усё адпавядала санітарным нормам і правілам: умовы працы, тэрыторыя, памяшканні. У дзіцячых садках можам правяраць харчаблокі, адпраўляем пробы на аналіз у нашу лабараторыю. Глядзім нават на аздабленне будынкаў: чым яны пафарбаваны, чым аклеены сцены, як праводзіцца ўборка... У жніўні ўдзельнічала ў прыёмцы школ да навучальнага года.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*Злева направа:* **Алена Лагавая, Наталля Свядыш і Кацярына Ефімкова ў лабараторыі Чэрвеньскага цэнтра гігіены і і эпідэміялогіі.**

Разам з Наталляй у цэнтр на пасаду ўрача-эпідэміёлага прыехала **мінчанка Алена ЛАГАВАЯ**. Дзяўчаты вучыліся на адным курсе, але ў розных групах. Пасля завяршэння вучобы ў сталіцы не было вакансій, таму інтэрна накіравалі ў Чэрвень. На месцы маладому спецыялісту далі пакой у інтэрнаце, цяпер яна наводзіць у ім прыгажосць.

— Гэта ні ў якім разе не нейкія амбіцыі ці ганарлівасць, але я ўсё ж-такі прывыкла да вялікага горада, таму ў Чэрвені мне пакуль цяжкавата, — прызнаецца Алена. — Галоўнае, што падабаецца, — магчымасць нармальна прагуляцца ў цішыні і спакоі. Можна сканцэнтравацца на іншым, я, напрыклад, пачала шмат чытаць.

Работа эпідэміёлага мае шмат агульнага з работай гігіеніста, але і адрозненняў хапае. Галоўны фронт работы — інфекцыі і эпідэміі, таксама яна сочыць за санітарным рэжымам у бальніцах. Калі чалавека ўкусіла дзікая жывёла і ёсць падазрэнне на шаленства, сітуацыю кантралюе эпідэміёлаг. Алена, як і Наталля, таксама нярэдка бывае на выездах, але правярае іншыя аспекты: рэжым дэзынфекцыі, рэгулярнасць медагляду супрацоўнікаў, выкананне тэмпературнага рэжыму захоўвання прадуктаў. Галоўная задача эпідэміёлага — папярэдзіць узнікненне масавых заражэнняў.

— Вядома, урач-гігіеніст ці ўрач-эпідэміёлаг — гэта не тое самае, што лечачы доктар, — пагаджаецца Алена. — Звычайна мы не прымаем пацыентаў, не ставім дыягназы. Але закрываем не менш важны «фронт» — прафілактычны. Калі б гігіеністы не кантралявалі выкананне ўмоў працы, то колькасць прафесійных захворванняў магла б рэзка ўзрасці.

Яшчэ адзін малады спецыяліст цэнтра — **урач-лабарант санітарна-гігіенічнай лабараторыі Кацярына ЕФІМКОВА.** Дзяўчына вучылася ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, на медыка-дыягнастычным факультэце. Як і Алене, ёй далі пакой у мясцовым інтэрнаце.

— Скажу абсалютна шчыра: за два гады я палюбіла Чэрвень, — усміхаецца Кацярына. — Мне падабаецца спакой, тут вельмі добразычлівыя жыхары. Адзінае, што на выхадныя я звычайна езджу ў Гомель ці Мінск, там больш магчымасцяў для адпачынку. Урач-лабарант у цэнтры займаецца аналізам харчовых прадуктаў і вады. Даследуюцца таксама фізічныя фактары: асветленасць, мікраклімат. Ёсць у нас і пост радыяцыйнага кантролю, дзе можна правяраць прадукты на ўтрыманне цэзію і іншых радыеактыўных ізатопаў.

Размаўляем з дзяўчатамі пра заробак. Аклад інтэрна — 290 рублёў, астатняе залежыць ад аб'ёму зробленай работы. У сярэднім спецыялісты, якія ўжо прайшлі інтэрнатуру, атрымліваюць 500—550 рублёў.

— Галоўнае, што нам падабаецца, — гэта рэжым работы і калектыў, — сыходзяцца ў думцы Наталля і Алена. — Адзіны мінус — шмат папяровай работы, хоць гэта не зусім наш профіль, бо мы павінны ўвесь час быць «у полі». Прафесія ў нас унікальная, такіх спецыялістаў, акрамя аднаго патоку ў БДМУ, ніхто ў Беларусі не рыхтуе. Першачарговая задача цяпер — удасканальвацца ў сваёй працы, магчымасць для гэтага ў нас ёсць.

**Праслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Чэрвень — Мінск.*

# МІЛЬЁН ПУНСОВЫХ РУЖ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сам комплекс пабудаваны тры гады таму па галандскай тэхналогіі. Спецыялісты з гэтай вядомай сваімі кветкамі краіны перыядычна прыязджаюць сюды, каб правяраць работу беларускіх калег і пракансультаваць іх (дарэчы, супрацоўнікі агракамбіната таксама нярэдка ездзяць у «краіну цюльпанаў», каб пераняць досвед тамтэйшых кветкаводаў). Адтуль жа прывезены і саджанцы. У цяпліцы ўвесь час падтрымліваецца вільготнасць каля 80 працэнтаў. Для гэтага пад столлю развешаны спецыяльныя пульверызатары, якія аўтаматычна замяраюць узровень вільгаці ў паветры і, калі трэба, распыляюць аэразоль.

Тэмпература ў памяшканні ўдзень не апускаецца ніжэй за 20 градусаў. Акрамя гэтага, над кустамі шчыльна размешчаны лямпы, якія даюць раслінам патрэбнае святло. Усяго за суткі ружы павінны асвятляцца 20 гадзін, таму зімой гэта абсталяванне працуе напоўніцу нават у светлы час. Але залішняга цяпла ружа таксама не любіць — улетку нярэдка даводзіцца прымяняць зашторванне, каб аберагчы расліну ад спёкі. Для таго, каб паветра не застойвалася ў адным месцы, працуюць спецыяльныя сістэмы вентыляцыі.

Увогуле, пераважную частку работы на комплексе выконвае аўтаматыка. Тым не менш у брыгадзе №5 працуе 18 кветкаводаў. Іх задача — непасрэдная нарыхтоўка кветак і догляд за асобнымі кустамі. За кожнай супрацоўніцай замацавана 1200 квадратных метраў — участак, за які яна нясе адказнасць і дзе праводзіць свой працоўны дзень. Сярод кветкаводаў шмат жыхарак Багатырова і навакольных пасёлкаў, адна з іх — Дар'я ЛІПЕНЬ. Дзяўчына скончыла Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, дзе вучылася на інжынера-тэхнолага. На камбінат прыйшла працаваць з простай прычыны — блізка ад дому. Спецыяльная адукацыя тут не патрабавалася — усіх кветкаводаў-навічкоў замацоўваюць за дасведчанымі калегамі, а вучоба адбываецца на месцы.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Рукі Дар'і Ліпень за некалькі гадоў ужо прызвычаіліся да «калючай» працы.**

— Староннім людзям здаецца, што зрэзка ружы — просты тэхнічны працэс, — расказвае Дар'я. — Па-першае, гэта трэба рабіць своечасова — з аднаго боку, нельга спяшацца, бо расліну можна пашкодзіць, з іншага, калі спазніцца, то не атрымаеш добры тавар. Па другое, зразаць таксама трэба ўмець — гэта робіцца на дакладнай даўжыні сцябла. Трэба выдаляць пасынкі, хвалістыя парасткі, рабіць шмат іншых працэдур догляду. Таму ўсё не так проста.

Куст ружы высаджваецца на пяць гадоў, увесь гэты час ён дае новыя і новыя кветкі. Гэта накладвае свой адбітак — у кветкаводаў сезон ніколі не завяршаецца. Камбінату ў Багатырове ўсяго тры гады, таму тутэйшыя расліны ў самай сярэдзіне свайго жыццёвага цыкла.

— Асабліва важны для нас час — святы, — кажа Дзіяна Грышкіна. — Да іх мы рыхтуемся загадзя. Каб вырасціць ружу да Дня святога Валянціна, нарошчваць масу кветак пачынаем ужо ў снежні, а ў студзені робім догляд па закладцы так званай «хвалі». Тры галоўныя даты для нашых кветкаводаў — 14 лютага, 8 Сакавіка і 1 верасня. Ці адрозніваецца наша ружа ад галандскай? Яна абсалютна аналагічная. Можа быць, у людзей ужо склалася пэўнае ўяўленне (тым больш, з-за мяжы звычайна прывяздзяюць спецыяльна адабраныя кветкі), але ніякай розніцы паміж імі няма. Усяго за год мы зразаем каля 2,5 мільёна кветак — у маштабах краіны гэта нямала.

Пасля зрэзкі ўся прадукцыя паступае ў халадзільную камеру, дзе пэўны час захоўваецца пры тэмпературы, блізкай да нуля градусаў — гэта робіцца, каб ружы добра стаялі. Потым яны паступаюць у сартавальную машыну. Камп'ютар раздзяляе прадукцыю паводле памеру бутона і ў залежнасці ад гэтага пакаштоўка ўкарочвае сцябло. Гэта гарантуе, што самая доўгая і дарагая кветка сапраўды будзе прыгажуняй. Адсюль яна ідзе на продаж.

— Шчыра скажу, мяне ўжо ружай не здзівіш, нават самай прыгожай, — смяецца Дар'я Ліпень. — Столькі я іх бачыла за гэты час! Таму любая іншая кветка, але не яна. Працаваць мне падабаецца, гэта не манатонная праца — штодзень новыя задачы і праблемы. Заробак таксама нядрэнны, каля сярэдняга па сталіцы. Трэба толькі прывыкнуць да тутэйшага клімату, а таксама да пастаяннага болю ад уколаў шыпоў — ад гэтага ніводная спецвопратка не ўратуе.

**Праслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# ЯНЫ ПРОСТА ДОРАЦЬ ЦУДЫ!

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ

**Яўгенія Бармоціна вось ужо дзесяць гадоў з'яўляецца сакратаром пярвічнай арганізацыі БРСМ філіяла «Магілёўскія цеплавыя сеткі» РУП «Магілёўэнерга». Як яна сама прызнаецца, за гэты час самай чулліваў і любімай акцыяй для яе сталі «Цуды на Калядах».**



Упершыню Яўгенія арганізавала збор падарункаў для Магілёўскага дома дзіцяці яшчэ ў 2006 годзе, гадам пазней да яго далучыўся і Бабруйскі дом дзіцяці. Стала ўжо добрай традыцыяй не толькі збіраць падарункі, але і наведваць дзяцей, праводзіць навагоднія паказы з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі (ролю якой выконвае Яўгенія). Адначасова наша гераіня з'яўляецца і камандзірам валанцёрскага атрада «Дапамога!» Сваю каманду набірала з самых нераўнадушных і адказных работнікаў прадпрыемства. Валанцёрскі атрад на чале з Яўгеніяй — жаданыя госці ў любой дзіцячай сацыяльнай установе. Дарэчы, камандзір прыцягвае да добрых спраў і сваіх дзяцей: першакласнікі выконваюць ролі мішак-таптыжак у матуліных прадстаўленнях і з дзяцінства вучацца міласэрнасці ў адносінах да іншых людзей.

Валанцёрскі атрад пад кіраўніцтвам Яўгеніі Бармоцінай круглы год аказвае дапамогу дзецям-інвалідам, сіротам і дзецям, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, яго ўдзельнікі наведваюць таксама пажылых людзей, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў рамках акцый «Шчасце ў падарунак», «Велікодны падарунак», «Дзень аховы дзяцей з БРСМ», «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям», «Нашы дзеці» і іншых. Дэвіз атрада — «Спяшайцеся рабіць добрыя справы!». Бо, як дадае Яўгенія, тое, што аддаў, — ніколі не згубіш!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*